This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2019.pp.13-16

Przegląd Środkowo-Wschodni, 4, 2019
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20190402

Data przesłania: 30.11.2017
Data akceptacji: 23.05.2018

**Юры Грыбоўскі**
Uniwersytet Warszawski
jgrzybowski@uw.edu.pl
ORCiD: 0000-0002-7359-487X

# Прадмова

Імя Юрыя Туронка, выдатнага даследчыка беларускай гісторыі, цяпер вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Нягледзячы на тое, што свядомае жыццё юбіляра прайшло не ў Беларусі, ён захаваў адданасць беларускасці.

Варта прыгадаць, што юбіляр з'яўляецца сынам Браніслава Туронка, студэнта віленскага Універсітэта Стэфана Баторыя, дзеяча Беларускага студэнцкага саюза ва УСБ, удзельніка беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху, г. зв. хадэцыі, у міжваеннай Польшчы.

Юнацтва Ю. Туронка прыпала на час вялікіх выпрабаванняў, якімі былі гады Другой сусветнай вайны. Сям'я Туронкаў тады жыла на беларуска-літоўскім памежжы – у Дукштах (цяпер Dūkštas, Ignalinos rajonas, Літва*)*. Потым была адаптацыя ў новай пасляваеннай рэчаіснасці, якая адбывалася ўжо ва ўмовах камуністычнай Польшчы.

Пасля заканчэння Гандлёвай акадэміі ў Шчэціне Ю. Туронак пераехаў у Варшаву, дзе атрымаў працу ў імпартна-экспартнай фірме хімічных вырабаў і адначасова выкладаў у Галоўнай школе планавання і статыстыкі. З 1956 годзе ажно да выхаду на пенсію працаваў у Польскай знешнегандлёвай палаце. Ён не застаўся ў баку ад тагачаснага культурнага жыцця польскіх беларусаў. Прозвішча юбіляра было вядома перш за ўсё ў сувязі з яго дзейнасцю ў Бе-

ларускім грамадска-культурным таварыстве. Працяглы час ён быў кіраўніком Варшаўскага аддзела БГКТ. Дзякуючы яго намаганням пры аддзеле ў Варшаве быў створаны навуковы гурток. Больш за тое, Варшаўскі аддзел БГКТ прычыніўся да стварэння кафедры беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце.

Першапачаткова лёс Ю. Туронка не быў звязаны з гістарычнай навукай. Аднак ужо ў пачатку 1960-х гадоў пачалі з'яўляцца яго першыя даследаванні. Як сам юбіляр згадваў, яго экскурс у гісторыю быў вынікам асабістага выбару, разумення грамадскай карысці ад навукі. Спадар Юры займаўся навукай без маральнай і матэрыяльнай падтрымкі, у вольны ад працы час. Можна меркаваць, што цікавасць менавіта да гісторыі беларускага нацыянальнага руху была абумоўлена радаводам і асабістым жыццёвым вопытам.

Першыя крокі як даследчык гісторыі Ю. Туронак пачаў рабіць у 1960-я гады, калі выйшлі яго працы, прысвечаныя беларусам у пасляваеннай Польшчы. Аднак юбіляр увайшоў у польскую гістарыяграфію перш за ўсё як аўтар першых грунтоўных прац па гісторыі нямецкай акупацыі, калабарацыі, беларуска-польскіх адносін у Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны. Штуршком да вывучэння менавіта гэтага перыяду стала цікавасць да постаці Вацлава Іваноўскага, аднаго з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага руху пачатку XX стагоддзя. Праз прызму дзейнасці гэтага чалавека ў Менску ў 1941-1943 гадах Ю. Туронак пачаў вывучэнне праблематыкі, звязанай з нямецкай акупацыяй Беларусі. Плёнам гэтага стала абарона ў 1986 годзе кандыдацкай дысертацыі. Сапраўдны розгалас у навуковым асяроддзі выклікалі яго працы „Białoruś pod okupacją niemiecką" (Вроцлаў, 1989) і „Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi" (Варшава, 1992). Публікацыі Ю. Туронка выклікалі сярод польскіх даследчыкаў яшчэ большую цікавасць да беларускай праблематыкі. Пры дапамозе гэтых прац многія даследчыкі здолелі адкрыць для сябе новыя, «несавецкія» старонкі беларускай гісторыі. Ю. Туронак па сутнасці ўзяў на сябе місію будаўніка мастоў паміж польскім і беларускім народамі. Ён

увайшоў у гістарыяграфію як даследчык польскі і беларускі адначасова, а вынік яго працы належыць гістарычнай навуцы па абодва бакі Буга. Невыпадкова, што часам яго называюць польска-беларускім гісторыкам.

У пачатку 1990-х гадоў, калі імя даследчыка стала вядома таксама беларускім гісторыкам і аматарам гісторыі, яно хутка і трывала ўвайшло ў канон беларускай гістрыяграфіі. Дзякуючы яго працам многія чытачы ўпершыню пазнаёміліся з невядомымі старонкамі гісторыі беларускага нацыянальнага руху першай паловы XX стагоддзя і, у выніку, інакш пачалі ставіцца да мінулага.

Сяргей Новікаў слушна адзначыў, што кніга «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (Мінск, 1993) была настолькі піянерскай працай, што беларускае навуковае асяроддзе проста не было гатова да сур'ёзнай навуковай дыскусіі з яе аўтарам. Нават тыя, хто не пагаджаўся з Ю. Туронкам, не былі ў стане на належным узроўні аспрэчыць яго вывады.

Патрэбен быў час, каб беларуская гістарыяграфія асэнсавала змест і сутнасць піянерскай працы Ю. Туронка. Варта адзначыць, што ён на працягу ўсёй навуковай дзейнасці не пакідаў «ваеннай» і «акупацыйнай» праблематыкі. Дзякуючы гэтаму беларуская гістарыяграфія атрымала шэраг чарговых каштоўных прац: «Беларуская кніга пад нямецкім кантролем. 1939-1944 гады», «Людзі СБМ» і інш. Належыць таксама падкрэсліць, што працы даследчыка дапамаглі многім маладым навукоўцам пераадолець савецкія стэрэатыпы і міфы. Адважна і пераканаўча аўтар знішчаў ранейшыя штучныя схемы гісторыі, пры гэтым не абыходзячы маўчаннем вострых і супярэчлівых момантаў мінуўшчыны.

Такім чынам, Ю. Туронак можа быць далучаны да класікаў сучаснай беларускай гістарычнай навукі.

Працы юбіляра вылучаюцца вельмі высокім навуковым узроўнем і імкненнем да аб'ектывізму. Ю. Туронак ставіць за мэту раскрыць сапраўдныя акалічнасці тых або іншых падзей, нягледзячы на тое, якімі яны былі, ён можа быць прыкладам прафесіяналізму

і сумленнасці, якія, на жаль, уласцівы далёка не ўсім тым, хто займаецца вывучэннем гісторыі.

Ю. Туронак адкрыў цэлы пласт цікавых і адначасова сур'ёзных праблем у гісторыі Беларусі і яе суседзяў. Выдатны ўклад даследчыка ў развіццё гістарычнай беларусістыкі бясспрэчны, а яго працы сталі сапраўднымі энцыклапедыямі ведаў. Не будзе перабольшаннем, калі сказаць, што цяпер аніводнаму саліднаму вучонаму, які займаецца гісторыяй беларускага нацыянальнага руху, польска-беларускіх узаемаадносін або нямецкай акупацыі Беларусі, цяжка абмінуць працы спадара Юрыя. Яго працы, нават тыя, якія выйшлі даўно, дасюль не страцілі сваёй актуальнасці і працягваюць выконваць ролю своеасаблівых праваднікоў для тых, хто даследуе складаную гісторыю Беларусі XX стагоддзя.

Акрамя прафесійных якасцей належыць таксама звярнуць увагу на добразычлівасць і чалавечую дабрыню юбіляра. Аўтар гэтых радкоў не ведае выпадку, калі б даследчык адмовіў у дапамозе іншым гісторыкам. Размовы з ім у яго ўтульнай варшаўскай кватэры заўсёды былі сапраўдным творчым святам і асалодай. Гаспадар захапляў сваіх суразмоўцаў адкрытасцю і шчырым жаданнем дапамагчы ў творчых пошуках. Ён ніколі не шкадуе парад і ахвотна дзеліцца ўласным вопытам, а вопыт мае велізарны.

Але яшчэ раз варта звярнуцца да навуковага набытку юбіляра. Многія з аўтараў гэтага выдання выхаваліся на працах Ю. Туронка, ім таксама абавязаны выбарам уласнага даследчыцкага шляху. У сувязі з гэтым не будзе перабольшаннем адзначыць, што Ю. Туронку ўдалося стварыць уласную гістарычную школу.

Гэта сціплая кніга з'яўляецца своеасаблівай данінай павагі цяперашняга пакалення даследчыкаў, якія нізка схіляюцца перад аўтарытэтам класіка. Няхай гэтае выданне будзе таксама формай удзячнасці за шматгадовую і плённую працу на гістарычнай ніве, шчырай падзякай даследчыку, імя якога назаўсёды запісана ў аналы беларусістыкі і заняло пачэснае месца побач з іншымі выдатнымі постацямі гістарычнай навукі.